# КРЫВІЯ

**Выданьне беларускае дыяспары ў Чэхіі**

**№14 Чэрвень - Жнівень 2009**

**Культурна-асьветніцкая газэта**


## З Ь М Е С Т


**Беларуская Чэхія**
Беларускія дні ў Празе - ст. **1**
Заява беларускае дэмакратычнае апазыцыі аб Усходнім Партнёрстве - ст. **2**
Беларускіх журналістаў пазбавілі акрэдытацыі на саміт у Празе - ст. **3**

**Навіны з Бацькаўшчыны**
Адмова ў рэгістрацыі БХД - ст. **5**
Сустрэча з кагрэсмэнамі ЗША - ст. **5**
Астравецкая АЭС - гэта злачынства - ст. **6**
БХД назвала свайго кандыдата - ст. **6**
На кандыдата вылучылі Міколу Статкевіча - ст. **7**
Лявона Баршчэўскага рэкамэндавалі - ст. **7**
Пяты Зьезд беларусаў сьвету - ст. **8**
5-му Зьезду беларусаў сьвету - ст. **10**
Уражаньні й назіраньні - ст. **11**
Лукашэнка пра 911 - ст. **12**
Славутая “Купалінка”- ст. **13**
Рашэньне аб закрыцьці праграмаў - ст. **14**
“З 2011 году будзем жыць як у Эўропе” - ст. **14**

**Беларусь у сьвеце**
Адкрыты ліст прэзідэнту Абаму - ст. **14**

**Спорт**
Гакейны чэмпіянат сьвету - ст. **15**
Беларусь - сусьветная сіла ў байдарачным спорце - ст.**15**

**Беларусы Эўразьвязу**
Аляксандр Рыбак - пераможца - ст. **16**
Дні беларускай культуры ў Познані - ст. **16**


**Беларуская Чэхія**

## ТРАВЕНЬ 2009: Беларускія дні ў Празе

У першым тыдні траўня 2009 адбыўся ў Празе шэраг беларускіх культурных і палітычных мерапрыемстваў, пераважна з нагоды правядзеньня 7-га траўня заснавальнага саміту Усходняга Партнэрства.

У іх прынялі ўдзел кіраўнікі беларускае дэмакратычнае апазыцыі, беларусы Чэхіі, а таксама шматлікія прадстаўнікі беларускае дыяспары з краінаў Эўразьвязу: Нямеччыны, Бэльгіі, Польшчы, Летувы.

**Каляндар падзеяў:**

* **Панядзелак 4-га траўня:** адбыўся паказ дакумэнтарнага фільму "Каралеўства Здохлых Мышэй," - на тэму жыцьця ў сучаснай Беларусі. У дыскусіі пасьля фільму выступалі прадстаўнік апазыцыі Алесь Лагвінец і былы чэскі сэнатар і палітычны дысыдэнт Ян Румль.

* **Аўторак, 5-га траўня** : Былыя дэмакратычныя прэзыдэнцкія кандыдаты Зянон Пазьняк, Станіслаў Шушкевіч , Аляксандр Мілінкевіч і Аляксандр Казулін, а таксама сп-ня Івонка Сурвілла, старшыня рады БНР , сустрэліся з чэскім прэм’ерам Міркам Тополянкам.

У той-жа дзень палітыкі сустрэліся з сябрамі беларускай грамады Прагі - пераважна са студэнтамі, і змаглі адказаць на пытаньні з публікі.

* **Серада, 6-га траўня:** дэмакратычныя палітыкі наведалі камітэт замежных справаў парляманту Чэскай Рэспублікі.

Увечары менскі Свабодны Тэатр выканаў п’есу "Пакаленьне Джынс."

Таксама, 5 і 6-га траўня прадстаўнікі дэмакратычнай апазыцыі, і беларускае грамады Чэхіі бралі ўдзел у міжнароднай канфэрэнцыі пад назовам "УСХОДНЯЕ ПАРТНЭРСТВА: Форум Грамадзянскай Супольнасьці."

* **Чацьвер, 7-га траўня:** беларускія дэмакратычныя палітыкі сустракаліся з Карлам Шварцэнбэргам, міністрам замежных справаў Чэхіі.

Папаўдні адбылася дэманстрацыя супраць існуючага палітычнага рэжыму ў Беларусі. Галоўнай мэтай яе было зьвярнуць увагу палітыкаў і жыхароў Эўразьвязу на палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі.



Імпрэза пачалася на плошчы ім. Палацкага на беразе ракі Влтавы. Адтуль беларуская моладзь прайшла зь бел-чырвонымі сьвягамі да будынку Кангрэсавага Цэнтру, дзе адбываўся заснавальны саміт Усходняга Партнэрства. Каля 200 беларускіх пікетоўцаў прывіталі афіцыйную беларускую дэлегацыю ( у бронеаўтамабілях) клічамі "Жыве Беларусь" і "Ганьба."



*Прэм'ер Тополянэк сустрэў дэманстрантаў*

Чэскі прэм'ер Мірэк Тополянэк выйшаў перад будынак Кангрэсавага Цэнтру, прывітаў пікетоўцаў і запэўніў іх, што Эўропа будзе кіравацца прынцыпамі дэмакратыі ў дачыненьні да Беларусі .

* **Чацьвер і пятніца, 7- 8-га траўня:** Чэская Акадэмія Навук ладзіла ў гэтыя дні міжнародную гістарычную канфэрэнцыю на тэму "Рэканструкцыя нацыянальнай гісторыі і будаваньня дзяржавы ў Беларусі, Чэхіі, Польшчы, Славаччыне і Ўкраіне пасьля камунізму - у параўнальнай пэрспэктыве."

У канфэрэнцыі бралі ўдзел запрошаныя беларускія гісторыкі: Др. Генадзь Сагановіч, Др. Аляксандр Смалянчук, Вольга Шаталава, Натальля Прыступа і Люба Козік.

# ЗАЯВА
## беларускае дэмакратычнае апазыцыі
## АБ УСХОДНІМ ПАРТНЁРСТВЕ

Мы вітаем ідэю "Усходняга партнёрства" і выказваем прызнаньне Эўразьвязу за ўключэньне ў гэтую праграму Рэспублікі Беларусь.

Мы разумеем важнасьць агульных задачаў, якімі кіруецца Эўразьвяз, прапануючы новы падыход у дачыненьні да антыдэмакратычнага рэжыму Лукашэнкі, які мэтанакіравана зьнішчае грамадзянскую супольнасьць у Беларусі.

Мы лічым, аднак, што забесьпячэньне правоў грамадзянскай супольнасьці і кожнага чалавека павінна стаць ўмовай дачыненьняў з аўтарытарнай уладай Аляксандра Лукашэнкі і мусіць быць адзначаная ў пратакольнай частцы партнёрства. Удзел грамадзянскай супольнасьці ва "Усходнім партнёрстве" стане гарантыяй пазытыўных крокаў, будзе ствараць магчымасьці станоўчага выбару для існуючай улады. Бяз гэтага ўдзелу Партнёрства не асягне станоўчых вынікаў і будзе скарыстана антыдэмакратычным рэжымам для апраўданьня сваёй разбуральнай дзейнасьці.

Мы засяроджваем увагу на антыкультурным характары рэжыму Лукашэнкі. Побач з разбурэньнем грамадзкай дзейнасьці і зламаньнем правоў чалавека гэты рэжым метадычна зьнішчае беларускую культуру, адукацыю і творчасьць, нацыянальную гістарычную навуку, а паўсюдную русіфікацыю зрабіў галоўнай асновай сваёй антыкультурнай палітыкі. Культура ў сучасным сьвеце становіцца адным з галоўных чыньнікаў суверэнітэту. Русіфікацыя і зьнішчэньне культуры павялічвае адмоўны ўплыў праімпэрскіх колаў расейскай палітыкі на Беларусі.

У прыярытэтных накірунках дзейнасьці "Усходняга партнёрства" мы хацелі б бачыць дапамогу па зьбераджэньні беларускай культуры ад сістэматычнага вынішчэньня антыбеларускім рэжымам. Мы прапануем да тых пяці пазыцыяў, вылучаных з 12-ці патрабаваньняў Эўразьвязу да ўлады ў Беларусі, дадаць шосты пункт аб забесьпячэньні свабоднага разьвіцьця беларускай культуры, адукацыі і творчасьці.

Мы лічым, што прыярытэтнымі накірункамі супрацоўніцтва ў галіне эканомікі маглі б стаць энэргетыка і дыверсіфікацыя паставак энэргетычных рэсурсаў, менавіта – інвестыцыі ў праектную і тэхналягічную дзейнасьць па транспартыроўцы энэргетычных рэсурсаў (нафты, газу, электрычнасьці).

Лічым неабходным таксама скасаваньне ўсіх перашкодаў з боку ўлады ў галіне доступу насельніцтва да інфармацыі і культурна-асьветніцкіх праектаў. Спрашчэньне візавага рэжыму і зьмяншэньне коштаў за візы для грамадзянаў Беларусі спрыяла б узаемаабмену думак і разуменьню дэмакратычнага ладу жыцьця.

Мы хацелі б прыцягнуць увагу палітыкаў Эўразьвязу да сігналаў аб выпрацоўцы сумеснай

стратэгіі Лукашэнкам і яго ўсходнімі саюзьнікамі ў дачыненьні да “Усходняга партнёрства.” На наш погляд, калі недаацаніць гэты чыньнік і не падключыць да праграмы “Усходняга партнёрства” ўсіх сілаў Рэспублікі Беларусь (уключна з эміграцыяй), то пэрспэктывы Партнёрства ў Беларусі могуць не разьвіцца, або спыніцца (што найгорш) на ўзроўні фактычнага прызнаньня і легітымізацыі недэмакратычнага рэжыму.

Адчуваючы адказнасьць за наш народ, мы зацікаўленыя ў жыцьцяздольнасьці партнёрскай праграмы. Мы спадзяемся, што наша пазыцыя будзе пачута і падтрымана ініцыятарамі і ўсімі ўдзельнікамі “Усходняга партнёрства.”

6 траўня 2009 г. Прага.

Івонка Сурвіла,
Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі,

Зянон Пазьняк,
кандыдат на прэзыдэнта Беларусі ў выбарах 1994 г.

Станіслаў Шушкевіч,
кандыдат на прэзыдэнта Беларусі ў выбарах 1994 г.

Аляксандар Казулін,
кандыдат на прэзыдэнта Беларусі ў выбарах 2006 г.

**Крыніца:** старонка Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі БНФ,
http://www.pbpf.org/

## Тлумачэньне Аляксандра Мілінкевіча: Я не падпісаў сумеснай заявы, бо такія заявы павінны быць вывeранымі

У інтэрв’ю з Ганнай Соўсь(Радыё Свабода) Аляксандар Мілінкевіч тлумачыць, чаму не далучыўся да сумеснай заявы Івонкі Сурвілы, Станіслава Шушкевіча, Зянона Пазьняка і Аляксандра Казуліна

**Ганна Соўсь:** Напярэдадні “саміту” Івонка Сурвіла, Зянон Пазьняк, Станіслаў Шушкевіч і Аляксандар Казулін выступілі з сумеснай заявай, у якой віталі ідэю Ўсходняга партнэрства і выказалі ўдзячнасьць Эўразьвязу за ўключэньне Беларусі ў гэтую праграму. 6 траўня госьцем Начной Свабоды быў Аляксандар Казулін, і ён выказваў спадзяваньне, што вы таксама падставіце свой подпіс пад заявай. Чаму вы гэтага не зрабілі?

**Мілінкевіч:** "Я падтрымліваў ў асноўным зьмест гэтай заявы, але такія заявы павінны быць вельмі пісьменнымі і выверанымі. Там ёсьць сцьвярджэньні, якія ня маюць, з майго пункту гледжаньня, факталёгіі. Напрыклад, гаварылася аб тым, што ў Расеі і кіраўніцтва Беларусі ёсьць плян, як разбурыць "Усходняе партнэрства".

Роля "Траянскага каня" адводзіцца Беларусі. Я ніводнага такога факта ня ведаю, таму прапанаваў гэты пункт зьняць. Такія меркаваньні не ўключаюцца ў сур'ёзныя заявы. І прапанаваў свой тэкст, але большасьць была за тое, каб гэты тэкст пакінуць"

**Крыніца:** Радыё Свабода, 7 траўня 2009 г.

## Беларускіх журналістаў пазбавілі акрэдытацыі на саміт у Празе

Чэскія ўлады адмянілі акрэдытацыю беларускага палітэмігранта і журналіста Аляксея Шыдлоўскага і іншых беларускіх журналістаў на саміт Усходняга Партнёрства.

Тыдзень таму Аляксей Шыдлоўскі быў акрэдытаваны на саміт як рэпарцёр газеты беларускіх эмігрантаў «Менск-Прага-Інфарм» разам з галоўным рэдактарам гэтага выдання Яўгенам Сідорыкам. Акрэдытацыя была пацьверджаная прэс-службай МЗС. Аднак сёньня раніцай Шыдлоўскі і Сідорык атрымалі ліст з прэс-службы, дзе было сказана, што ў мэтах бясьпекі некаторых удзельнікаў саміту акрэдытацыя была адмененая службай аховы.

«Пазбаўленьне беларускіх журналістаў акрэдытацыі мы лічым неабгрунтаваным і прадузятым. Перадумоваў для такога рашэньня ў службы бясьпекі ня было. Я ня ведаю, хто даў указаньне выкрасьліць беларусаў, але з такімі сітуацыямі я неаднаразова сутыкаўся і ў Беларусі. Эўропа працягвае гуляць у цынічныя гульні зь беларускім рэжымам і ва ўсім яму патураць. Такія гульні могуць скончыцца вельмі сумна, бо таталітарызм заразны,» -- пракамэнтаваў тое, што адбылося, Аляксей Шыдлоўскі.

**Крыніца:** Хартыя 97, 5 траўня 2009 г.

## ПАДЗЯКА

* сп. **Андрэю Навуменку** за ідэю й выраб мэдалёў *“УЗНАГАРОДЫ за грамадзкую дзейнасьць,”* што раздаваліся пры сьвяткаваньні Дня Волі 2009. (глянь ніжэй)

* **Усім сябром грамады**, якія памаглі падрыхтаваць нацыянальныя сьцягі й плякаты на дэманстрацыю 7-га траўня ў Празе.




## ПАДЗЯКА

Рэдакцыя выказвае шчырую падзяку
сп-ні **Жане Віткоўскай**
і сп. **Віталю Цімошчанку**
за фінансавую дапамогу пры раздрукаваньні гэтага нумару газэты.

## Адзначаньне 480-тых угодкаў прыняцьця Першага Статуту Вялікага Княства Літоўскага 1529 г.

адбылося ў Празе ў чацьвер 11-га чэрвеня 2009.

Сьвяточная Праграма складалася з :

- Канцэрту гурту СТАРЫ ОЛЬСА

з выкананьнем тагачасных песьняў Вялікага Княства Літоўскага

- Гутарка на тэму
"Як беларусы Эўропе падаравалі Статут"
( гісторык Ніна Скеп'ян)

Гістарычная імпрэза прайшла на сьвежым (і халаднаватым паветры). Аднак бальшыня публікі (30-40 чалавек) змагла пагрэцца сярэднявечнымі танцамі пад музыку Старога Ольсы (гл. здымак.)



*Танцы пад музыку Старога Ольсы - Фота: А. Навуменка*

---

## Канцэрт сьпявачкі Тацьцяны Беланогай

адбыўся ў Празе ў пятніцу 26-га чэрвеня 2009.

Ведамая ў Беларусі сьпявачка пачаставала пераважна маладую публіку багатым рэпэртуарам песьняў із сваіх альбомаў **ДЗЬВЮХКРОП'Е** й **ПАБАЧЫЦЬ СЬВЕТ**.

Тацьцяна таксама выканала шэраг песьняў паводля пажаданьняў публікі.

Падчас перапынку адбылося ўрачыстае ўзнагароджаньне сяброў беларускае грамады мэдалямі *За грамадзкую дзейнасьць,* і лятарэя.

Пра дзейнасьць сьпявачкі можна даведацца больш на: **www.bielanohaja.org**



## ВІНШУЕМ нашых студэнтаў з дыплёмамі!

* **Вольгу Дудко** з дыплёмам магістра эканоміі (у красавіку 2009, пры VŠE ў Празе). Тэма ейнай дысэртацыі: "Эканамічная трансфармацыя ў Беларусі"

* **Паўла Котава** з дыплёмам бакалаўра гісторыі (у красавіку 2009, на Карлавым Унівэрсытэце ў Празе).

## ВІНШУЕМ нашых сяброў з НАРОДЗІНАМІ!

**у ЧЭРВЕНІ**:
**Тацяну Кажамяка**

**у ЛІПЕНІ**:
**Ірыну Станкевіч, Генадзя Кажамяку**
**Вольгу Смалянчук**

**у ЖНІЎНІ**:
**Івана, Мартіну Сапегін**

## Адмова ў рэгістрацыі Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі

Міністэрства юстыцыі адмовілася рэгістраваць партыю Беларуская хрысьціянская дэмакратыя, заявіўшы, што дзяржпошліна за рэгістрацыю партыі была выплачаная нібына на няправільны рахунак. Куды падзеліся 1 750 00 0 рублёў – невядома.

Як паведаміў 16 красавіка на прэс-канферэнцыі ў Менску адказны сакратар аргкамітэта партыі БХД Дзяніс Садоўскі, ён асабіста хадзіў у Міністэрства юстыцыі, каб задаць чыноўнікам шэраг пытаньняў – у тым ліку і пра тое, на які рахунак трэба заплаціць дзяржпошліну за рэгістрацыю партыі. У міністэрстве паведамілі, што «усе неабходныя зьвесткі можна знайсьці на інфармацыйным стэндзе і на сайце Мінюста».

«Аднак на стэндзе ў Міністэрстве юстыцыі ня было нічога дакладнага. На сайце міністэрства былі пазначаныя рахункі, на якія можна пералічыць дзяржпошліну. Але калі мы туды пераявілі грошы, у Мінюсце заявілі, што з 31 сьнежня 2008 года рахунак зменены.

Учора я зноў зайшоў на сайт Мінюста. Там пералічаныя рахункі. Тыя ж самыя, на якія мы пераводзілі грошы. Пытаньне да начальніка ўпраўленьня грамадскіх аб'яднаньняў Міністэрства юстыцыі Алега Сліжэўскага: дзе нашыя грошы? Мы гэтае пытаньне будзем яшчэ абмяркоўваць, падамо ім усе справаздачы, і будзем патрабаваць вяртаньня нашых грошаў», – заявіў Дзяніс Садоўскі.

Сустаршыня партыі БХД Павал Севярынец таксама паведаміў, што ў адказе, які кіраўніцтва партыі атрымала ўчора з Міністэрства юстыцыі, пазначалася яшчэ адзін прычына адмовы ў яе рэгістрацыі: «Пададзеныя дакументы не адпавядаюць вынікам апытаньня заснавальнікаў партыі БХД, праведзенага Мінюстам».

Як сьцьвярджае Міністэрства юстыцыі, атрыманыя доказы парушэньня працэдуры вылучэньня дэлегатаў зьезду: некаторыя заснавальнікі партыі недакладна называлі колькасьць актывістаў, якія прысутнічалі на рэгіянальных сходах па вылучэньні дэлегатаў.

«Праз паўтары – два месяцы пасля правядзеньня ўстаноўчага зьезду партыі, які адбыўся 28 лютага, заснавальнікаў партыі выклікалі ў Мінюст, у мясцовыя выканкамы, у ідэалагічныя аддзелы, запалохваючы іх звальненьнем з працы ці выключэньнем з навучальных установаў. Калі задавалі пытанне «Колькі людзей абралі ў дэлегаты?», чалавек, узгадваючы, адказваў, што чалавекі тры. А ў пратаколе, скажам, было чатыры. На падставе гэтага Міністэрства юстыцыі лічыла, што інфармацыя «неадпавядае рэчаіснасьці», - распавёў Павал Севярынец.

«Апытанне Мінюста не адпавядае заканадаўству, бо людзей запалохвалі. **Таму адмова ў рэгістрацыі партыі – гэтае не юрыдычнае, а палітычнае рашэнне.**

Нашай мэтай зьяўляецца не рэгістрацыя партыі ў Міністэрстве юстыцыі, а прасоўваньне ў Беларусі хрысьціянскіх каштоўнасьцяў. Мы не баімся рэпрэсіяў з боку ўладаў – бойся Бога, і нікога больш!» - сказаў Павал Севярынец.

Як паведаміў сустаршыня партыі БХД Аляксей Шэін, кіраўніцтва партыі мае намер абскардзіць адмову Мінюста ў судзе.

«У нас сур'ёзныя падставы лічыць, што адмова ў рэгістрацыі партыі неадпавядае заканадаўству. Кампаніі і акцыі, якія праводзіла партыя, будуць і надалей праводзіцца. Мы адчуваем прызнаньне партыі людзьмі, а таксама салідарнасьць хрысьціянскіх дэмакратаў у іншых краінах», - адзначыў палітык.

Нагадаем, дакументы на рэгістрацыю партыі Беларуская хрысьціянская дэмакратыя былі пададзеныя ў Мінюст 12 сакавіка. Устаноўчы зьезд БХД прайшоў 28 лютага, на ім прысутнічала 211 дэлегатаў і больш за 300 гасьцей з Беларусі і іншых краінаў. Па выніках выбараў сустаршынямі партыі сталі Георгі Дзмітрук, Віталь Рымашэўскі, Павал Севярынец і Аляксей Шэін.

**Крыніца:** Хартыя 97, 16 красавіка, 2009

## Беларускія апазіцыянеры сустрэліся ў Вільні з кангрэсменамі ЗША

Лідэры беларускай апазіцыі перадалі кангрэсменам свой план дэмакратызацыі Беларусі.

Сустрэча адбылася 16 красавіка ў Вільні. На ёй прысутнічалі былы кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Казулін, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, намесьнік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка, намесьнік старшыні руху «За Свабоду» Віктар Карняенка, сустаршыня аргкамітэту па стварэньні партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» Віталь Рымашэўскі, старшыня Беларускай асацыяцыі журналістаў Жана Літвіна.

Дэлегацыя Кангрэсу ЗША, якую ўзначальвае Шэлі Берклі, была прадстаўленая чатырма чальцамі Кангрэсу ад Дэмакратычнай партыі і трыма — ад Рэспубліканскай партыі.

«У нас адбылася зацікаўленая гутарка пра сітуацыю ў Беларусі, – сказаў Лябедзька. – Мы перадалі кангрэсменам наш план па дэмакратызацыі Беларусі, так званую дарожную карту».

Беларускія ўдзельнікі ўзьнялі пытаньне пра палітвязьняў, палітневыязных, гвалтоўны прызыў у армію маладых людзей, якія не павінны па медыцынскіх паказан нях служыць, а таксама пра тое, як ім бачыцца ўдзел амэрыканцаў у дыялогу з беларускімі ўладамі, перадае сайт ucpb.org.

«Мы за тое, каб была еўраатлантычная кааліцыя па беларускім пытаньні, каб у Менск прыяжджалі сумесныя дэлегацыі, у якія ўвайшлі б прадстаўнікі і Дзяржпэпартаменту і Еўрапейскай Камісіі, – сказаў Анатоль Лябедзька. – І, магчыма, было б карысным

стварыць сумесную групу, у якую ўвайшлі б дэпутаты з Еўрапарламенту пасля выбараў і Кангрэсу ЗША. Прынамсі, для нас гэта дастаткова важна. Мы казалі пра Акт падтрымкі дэмакратыі ў Беларусі, пра неабходнасьць працягу дзеян ня такога дакументу, які вызначае палітычны і прававы калідор, на якім і засноўваецца пазіцыя ЗША ў дачынен ні да Беларусі».

Па словах лідэра АГП, прадстаўнікі Кангрэсу ЗША адзначылі, што «не чакаюць ніякіх пераменаў у пазіцыі Вашынгтона ў дачыненьні да Беларусі».

«Яны сказалі, што для ЗША галоўнае – гэта дэмакратыя і захаваньне правоў чалавека. І з гэтай пазіцыі Вашынгтон сыходзіць ня будзе», – паведаміў Лябедзька.

Нагадаем, раніцай 16 красавіка пры перасячэньні беларуска-літоўскай мяжы ў беларускіх палітыкаў узьніклі праблемы. Па словах Анатоля Лябедзькі, прыкладна ў 9.00 пры перасячэньні мяжы ў пункце пропуску «Каменны Лог» Аляксандру Казуліну прапанавалі запоўніць дэкларацыю і прайсьці дагляд. Пільную ўвагу памежнікі зьвярнулі на актывіста моладзевай апазіцыі Артура Фінькевіча. Яму паставілі ў пашпарт адзнаку пра тое, што ён часова невыязны, і адправілі маладога чалавека на спадарожнай машыне ў Менск.

На думку Лябедзькі, беларускія памежнікі і мытнікі зрабілі ўсё, каб палітыкі на сустрэчу з кангрэсменамі не пасьпелі. «На літоўскім баку была чарга з машынаў гадзіны на дзьве, – сказаў старшыня АГП. – Але літоўскія памежнікі, калі мы ім патлумачылі сітуацыю, прапусьцілі нас без чаргі. Толькі дзякуючы гэтаму мы пасьпелі на гэтую сустрэчу».

**Крыніца:** Хартыя 97, 16 красавіка, 2009

## Астравецкая АЭС - гэта злачынства

Будаўніцтва Астравецкай АЭС – гэта не грамадскае, а ваенна-палітычнае рашэньне. Такое меркаван не выказаў падчас прэс-канферэнцыі ў Менску адзін з каардынатараў кампаніі “Астравецкая атамная – гэта злачынства” Мікалай Уласевіч.

Грамадзкая ініцыятыва “Астравецкая атамная – гэта злачынства” зьявілася каля паўгады таму, калі стала вядома, што менавіта ў гэтым экалагічна чыстым рэгіёне ўлады плануюць пабудаваць беларускую АЭС. Аднак патрабаваньні грамадзтва правесьці шырокую дыскусію па гэтым пытаньні мясцовыя ўлады ігнаруюць. Больш за тое, на каардынатараў кампаніі пачалося сапраўднае паляваньне, распавядае Мікалай Уласевіч:

- Нам прыходзіцца працаваць ва умовах правакацыяў. Былі нядаўна вобыскі. Толькі я ў суботу атрымаў паведамленьне, што ў дачыненьні да мяне як да рэдактара газеты "Астравецкі весьнік" спынена справа.

Гаворка ідзе пра газэту "Астравецкі веснік", наклад якой быў канфіскаваны некалькі тыдняў таму. Цяпер, згодна з рашэн нем Міністэрства інфармацыі, ўвесь наклад, прысьвечаны праблеме будаўніцтва Астравецкай АЭС павінен быць зьнішчаны.

Мікалай Уласевіч лічыць, што рашэньне пабудаваць АЭС каля мяжы з Еўрапейскім зьвязам мае “ваенна- палітычны характар”. Актывіст заклікае ўсіх неабыякавых да лёсу краіны людзей далучыцца да антыядзернай ініцыятывы.

**Крыніца:** Кастусь Вансяцкі, Радыё Рацыя, Менск.

## БХД назвала свайго кандыдата

Кандыдатам ў прэзідэнты ад сваёй партыі Беларускія хрысьціянскія дэмакраты абралі 34-гадовага сустаршыню, міжнародніка, былога сябра Аб’яднай грамадзянскай партыі Віталя Рымашэўскага. Першым крокам, па яго словах, у выпадку свайго абраньня палітык абяцае зрабіць кадравыя зьмены ў кіруючым апараце краіны.

- Першым захадам любога чалавека, які прыйдзе да ўлады, бязумоўна, будзе назначэньне людзей на кіруючыя пасады – міністэрскія пасады і пасады тых людзей, якія кіруюць Рэспублікай Беларусь. Што тычыцца астатняга, то, бязумоўна, трэба будзе пераглядаць вялікую колькасьць заканадаўчых актаў, пачынаючы ад Закону аб свабодзе сумленьня да Закону аб СМІ.




Віталь Рымашэўскі

Апроч гэтага, на думку Віталя Рымашэўскага, у краіне мусіць быць усталяваны такі заканадаўчы парадак, каб органы дзяржавы не перашкаджалі дзейнасьці хрысьціянскіх цэркваў, як каштоўнаснага падмурку беларускага народу. Нагадаем, што наступныя прэзідэнцкія выбары ў Беларусі адбудуцца ў 2010-2011 годзе, а пра свой удзел у іх ужо заявілі Аляксандр Лукашэнка, ды лідэр Руху “За Свабоду!” Алесь Мілінкевіч.

**Крыніца:** Барыс Гарэцкі, Радыё Рацыя, Менск. 23.5

### Выхад з крызісу магчымы пасьля адстаўкі Лукашэнкі

73 адсоткі беларусаў лічаць, што адстаўка дыктатара дапаможа выхаду Беларусі з крызісу.

Сайт Хартыі’97 прапанаваў чытачом адказаць на пытаньне «На Ваш погляд, ці дапаможа адстаўка А.Лукашэнкі выхаду Беларусі з крызісу?»

Адмоўна адказалі на гэтае пытанне толькі 27,1 адсотка апытаных.

72,9 адсотка заявілі, што адстаўка Лукашэнкі неабходная для выхаду краіны з крызіснага стану.

**Крыніца:** Хартыя 97, 22 сакавіка 2009.

## На кандыдата ў прэзыдэнты вылучылі Міколу Статкевіча

Сёньня ў Менску на Кангрэсе эўрапейскага выбару кандыдатам на кандыдата ў прэзыдэнты падтрыманы лідэр БСДП Народная грамада Мікола Статкевіч.

У менскім Палацы культуры МТЗ прайшоў Кангрэс эўрапейскага выбару, які ініцыяваў адзін з лідэраў беларускай сацыял-дэмакратыі Мікола Статкевіч. Мерапрыемства падтрымалі асобныя сябры «Эўрапейскай кааліцыі», а таксама кіраўніцтва Партыі БНФ.




*Мікола Статкевіч*

У ходзе галасаваньня на кангрэсе адзін з магчымых супернікаў Статкевіча, кіраўнік аргкамітэту Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі “Свабода” Сяргей Скрабец зьняў сваю кандыдатуру. За Статкевіча выказалася абсалютная большасьць з 200 дэлегатаў, што ўзялі ўдзел у галасаваньні.

**Крыніца:** Радыё Свабода, 20.6 2009

## Лявона Баршчэўскага рэкамэндавалі ў кандыдаты на прэзыдэнта

Старшыню Партыі БНФ Лявона Баршчэўскага сёньня рэкамэндавалі ў якасьці партыйнага кандыдата ў кандыдаты на прэзыдэнта Беларусі. Адпаведнае рашэньне прынятае на прайшоўшым у Палацы культуры Менскага трактарнага заводу сходзе-наразде. Гэта рашэньне носіць выключна рэкамэндацыйны характар. А афіцыйнае абраньне плянуецца зрабіць на партыйным з’езде.

Супраць Лявона Баршчэўскага галасаваў толькі адзін удзельнік сходу. Яшчэ сем чалавек устрымаліся. Усе астатнія (а паводле арганізатараў, зарэгістраваліся больш за 220 чалавек) падтрымалі свайго партыйнага лідэра.

Першы намесьнік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка сказаў “Свабодзе”, што нічога дзіўнага ў абраньні менавіта кіраўніка партыі няма. Спадар Баршчэўскі мае досьвед парлямэнцкай працы, правёў некалькі цікавых і карысных акцыяў, адукаваны, інтэлігентны чалавек.

Яшчэ да пачатку галасаваньня Лявон Баршчэўскі публічна пагадзіўся вылучацца на высокую пасаду і паабяцаў весьці сябе годна:

“На будучых прэзыдэнцкіх выбарах павінен сур’ёзна ўключыцца ў бойку кандыдат, які пойдзе да канца і не прызнае сваёй паразы, калі выбары будуць зноўку праводзіцца па сумна вядомых сцэнарах. Калі я атрымаю неабходную падтрымку (а на гэта трэба вельмі прапрацаваць, ведаючы, як зьбіраўся наш сёньняшні сход), то я ўрачыста гатовы паабяцаць: мяне не пераманяць, не перакупяць і не пераманяць”.




*Лявон Баршчэўскі*

Прэтэндэнтаў на вылучэньне ад партыі было шмат. Кожны ўдзельнік сходу атрымаў ліст зь імёнамі і біяграфіямі дзесяці чалавек, якіх рэкамэндавалі на мясцовых партыйных сходах.

Сяргей Мальчык і Аляксандар Мех ужо на сёньняшнім сходзе адмовіліся ад далейшай барацьбы. Іван Шэга не змог тут прысутнічаць, паколькі знаходзіцца за мяжой. А яшчэ шэсьць патэнцыйных кандыдатаў – Сяргей Салаш, Лера Сом, Рыгор Кастусёў, Зьміцер Салаўёў, Сяргей Антусевіч і Ігар Лялькоў даслалі спэцыяльны ліст. Яны паведамілі, што не прыйдуць на сход, паколькі ён супярэчыць статуту партыі.

Арганізатары сходу так не лічаць – яны гавораць, што кіраўнік партыі можа самастойна прызначыць такую нараду. Сёньня раніцай, перад пачаткам сходу, яны спрабавалі правесьці паседжаньне сойму, каб на ім дадаць сходу дадатковую легітымнасьць. Пра тое, што адбылося, гаворыць прафэсар Юры Хадыка:

“У нас вельмі часта здараецца, што людзі, якія займаюць узважаную пазыцыю адсутнічаюць з тых ці іншых прычынаў. Так было і сёньня. Трыгубовіч – за мяжой, Голубеў – за мяжой, Бяляцкі – няведама дзе. І нам як раз і не хапіла для кворуму трох чалавек.

Пры поўнай адсутнасьці нашых маладых “рэвалюцыянэраў, якім не падабаецца напісанае ж імі палажэньне аб паўнамоцтвах старшыні партыі”.

**Крыніца:** Уладзімер Глод, Радыё Свабода, 20. 6 2009

# V Зьезд беларусаў сьвету

*Алесь Адамковіч, Вільня*

18-19 ліпеня 2009 г. у Менску праходзіў V Зьезд беларусаў сьвету. Ад Таварыства Беларускай Культуры ў Літве на ім прысутнічала 7 дэлегатаў: старшыня ТБК Хведар Нюнька і сябры Рады ТБК Леакадзія Мілаш, Крыстына Балаховіч, Сяргей Карабач, Васіль Акуневіч, Алесь Трусаў і Алесь Адамковіч. Усяго ж з Літвы прысутнічаў 21 чалавек.

Дэлегатаў і гасьцей зьезду прывітала Прэзідэнт Беларускай Народнай Рэспублікі Івонка Сурвілла. Яе голас прагучаў у зале ў запісе, бо яна сама па палітычных прычынах не змагла прыехаць на этнічную Бацькаўшчыну і асабіста прывітаць сваіх суродзічаў. Прэзідэнт жа краіны тытульнай нацыі нават не палічыў за патрэбнае павіншаваць прыехаўшых у Менск беларусаў з усяго сьвету. Відаць таму, што прыехалі менавіта беларусы, а ня рускія.

На зьездзе прысутнічалі прадстаўнікі некаторых амбасадаў у Беларусі. **Вельмі было прыемна чуць прамову амбасадара Швецыі Стэфана Эрыксона на добрай беларускай мове, які прывітаў беларусаў сьвету.**

На жаль лёс беларусаў такі, што яны не патрэбныя ў сябе на Бацькаўшчыне, дый не патрэбныя нідзе. Улады хацелі б бачыць іх памяркоўнымі да рэжыму і зрусіфікаванымі, а не нацыянальна свядомымі. Нават і памяшканьня для правядзеньня з'езду знайсьці было немагчыма. Толькі ў апошні час знайшліся дзьве залі: у Міжнародным адукацыйным цэнтры і на трактарным заводзе. Для правядзеньня зьезду была выбраная заля Міжнароднага адукацыйнага цэнтру. Ня гледзячы на ўсе цяжкасьці і перашкоды ўсё ж такі прысутнічалі прадстаўнікі ўлады. Цяжка адназначна зразумець гэты крок. Ня думаю, што гэта паварот дзяржавы да Беларусі і беларускасьці. **Відаць ім у сёньняшні цяжкі час эканамічнага крызісу спатрэбілася падтрымка беларускай дыяспары, палітычную моц якой яны ўсё ж адчуваюць і разумеюць яе значэньне ў вырашэньні ролі Беларусі. І таму, калі дыяспара прызнае гэты рэжым, то ў вачох дэмакратычнага сьвету ён будзе таксама прызнаным.**

А пануючая ўлада разьдзяліла беларусаў, як адзначыў былы старшыня „Бацькаўшчыны" Алесь Марачкін, лініяй Сталіна на два варожыя лагеры: на беларусаў чэсных і нячэсных. І вось сабраныя тут суродзічы з большага былі зь нячэсных. Таму думаю, што нават і ня мае падставаў меркаваць, што рэжым паварочваецца тварам да беларускасьці. Русіфікацыя набыла нават больш страшны выгляд, чым за часамі таго ж Сталіна. І самы галоўны кіраўнік дзяржавы беларусаў у адкрытую заяўляе, што на беларускай мове нават нельга выказаць нічога вялікага. За гэту мову зьбіваюць на вуліцах, судзяць, садзяць у вастрогі. І ў той жа час паўсюль крычыцца, што створаны найлепшыя ўмовы па захаваньні беларускай мовы і культуры.

Слухаючы прамовы беларускіх чыноўнікаў складалася ўражаньне, што ніколі ня было лепшых умоваў для разьвіцьця культуры і мовы тытульнай нацыі. І нават падумалася, што прыехаўшы на наступны зьезд, мы апынемся ў цалкам беларускай Беларусі. На вуліцах, у крамах, школах, універсітэтах будзе гучаць толькі беларуская мова, будуць адноўленыя, захаваныя і рэстаўраваныя амаль усе помнікі культуры і архітэктуры. Хаця задэкляравалі пра гэта, бо раней і такога пачуць было нельга. І мову дыялогу з дыяспарай абралі між іншым беларускую. Прычым не трасянку. І ўсе чыноўнікі, за рэдкім выключэньнем, прамаўлялі на добрай беларускай мове.

**Бальшыня дэлегатаў, ня гледзячы на ўсе прамовы і запэўніваньні чынавенства, была заклапочана лёсам і станам нацыянальнай культуры і мовы**. З большага, у гэтай дзяржаве ўсё беларускае вынішчана. І беларус у Беларусі сёньня ўспрымаецца цалкам рускамоўным. І відаць, у гэтым перашкода дыяспары, якая яшчэ захоўвае мову продкаў і ідэнтыфікуе сябе ня тымі беларусамі, а сьвядомымі, са сваёй тысячагадовай культурай і гісторыяй, а ня часткай велікарускага народу

Дзяржава сёньня прызнае, што трэба больш шчыльна супрацоўнічаць з дыяспарай і дапамагаць ёй ня толькі маральна, але і матар'яльна. Але ў той жа час зазначалася, каб беларускія бізнесоўцы замежжа ўкладалі свае грошы ў беларускую эканоміку. Зноў жа спроба знайсьці карысьць для сябе.

Гісторык Натальля Гардзіенка адзначыла, што за межамі Беларусі пражывае 2,5-3,5 мільёнаў беларусаў. І сёньня варта ня толькі наладжваць з імі супрацоўніцтва, але і стварыць умовы па вывучэньню беларускай дыяспары. Бо і да сёньня нават невядома дакладнай колькасьці беларускіх арганізацыяў у замежжы.

Самі ж дыяспары падзеленыя і не заўжды кантактуюць паміж сабой. Усё спрацоўвае тая самая лінія Сталіна. Самай моцнай і нацыянальна свядомай была паваенная эміграцыя. Сёньняшняя эміграцыя ў асноўным носіць эканамічны характар і вельмі мала сучасных эмігрантаў далучаюцца да беларускага руху ў замежжы. Аб гэтым адзначыў доктар Янка Запруднік з ЗША. У гэтую краіну эмігруе вялікая колькасьць беларусаў, але дыяспара практычна не адчувае ў сябе новых і маладых людзей. Старыя дзеячы адыходзяць, а іх няма кім замяніць. І такім чынам зьнікаюць некалі моцныя беларускія цэнтры ў розных краінах, напрыклад, як у Аўстраліі. Прычына ў нізкай свядомасьці беларусаў і ў не жаданьні гуртавацца вакол нацыянальнай ідэі.

**Адно з асноўных патрабаваньняў дэлегатаў зьезду - наданьне беларускай мове статус адзінай дзяржаўнай. Трэба ўлічваць той фактар, што нават і безь дзяржаўнай падтрымкі і правядзеньня русіфікатарскай палітыкі, беларуская мова ў соцыялінгвістычным аспекце так ці інакш слабейшая за расейскую, і таму будзе выцясьняцца апошняй. І толькі ў тым выпадку, калі толькі яна будзе адзінай дзяржаўнай, зможа вярнуцца да беларусаў як мова іх штодзённай камунікацыі.**

Таксама адным з важных патрабаваньняў было вяртаньне гістарычнай памяці беларускай нацыі і ўшанаваньне слаўных момантаў нацыянальнай гісторыі на дзяржаўным узроўні. Гэта ня толькі пастаноўка помнікаў вялікім беларусам, але і належнае сьвяткаваньне такіх датаў, як Дзень абвяшчэньня БНР (25 сакавіка), Грунвальдзкая бітва (15 ліпеня), Дзень вайсковай славы (8 верасьня) і інш. Было прапанавана, наступны год абвесьціць годам Ларысы Геніюш і яе цалкам рэабілітаваць. У наступным годзе будзе адзначацца яе стагоддзе.

Старшыня ТБМ Алег Трусаў прапанаваў наступны год абвесьціць годам роднай мовы.

**Прадстаўнікоў беларускай дыяспары хваляваў кошт візаў у Беларусь. На іх думку гэта значная перашкода ў кантакце з метраполіяй і таксама спрычыняецца да дэнацыяналізацыі беларусаў.** Яны лічаць іх непамерна высокімі а таксама няпрымальнымі многія дзеяньні як супрацоўнікаў беларускіх амбасадаў, так і беларускіх памежнікаў. Як зазначыў Яўген Вапа (Польшча), мытнікі

і памежнікі адмыслова на мяжы канфіскуюць беластоцкую „Ніву“, часам без усялякіх прычынаў адмаўляюць у візах для ўезду ў Беларусь і г.д. Прад’яўляліся прэтэнзіі, што ў большасьці амбасадаў ня ўбачыш нічога па-беларуску і не пачуеш беларускага слова, ня ўбачыш ні адной абвесткі на роднай мове. І нават складаецца такое ўражаньне, што патрапіў не ў амбасаду Рэспублікі Беларусь, а Расейскай Федэрацыі. У адным з тлумачэньнямі прадстаўніка беларускага МЗС можна пагадзіцца, калі ён зазначыў, што многія пачынаюць узгадваць, што яны беларусы толькі тады, калі ім патрэбна віза ў Беларусь. Хаця тут можна знайсьці і кампраміснае рашэньне: выдаваць бясплатныя візы толькі дзеячом беларускіх дыяспараў.

**Многіх хваляваў і закон аб беларусах замежжа. Падобныя ёсьць прынятыя ў Польшы, Літве і іншых краінах. На думку многіх, ён спрычыніўся б для беларусаў на чужыне на карысьць атаясамленьня іх беларусамі і захаваньню памяці аб зямлі сваіх продкаў. Бо гэты момант, як веданьне таго, што цябе з Радзімай зьвязваюць не толькі карані, але і нейкія палітычныя моманты (карта беларуса напрыклад), толькі будуць узмацняць у многіх выхадцаў з Беларусі сваю ідэнтыфікацыю на карысьць беларускай. Чалавек, які адчувае, што ён не патрэбны на радзіме продкаў, асімілюецца вельмі хутка.**

Асноўным чыньнікам захаванасьці беларусаў у гэтым сучасным сьвеце глабалізацыі і урбанізацыі можа быць толькі беларуская мова. Да гэтага этнічную памяць захоўвала беларуская вёска, якая і стала захавальнікам беларускага этнасу. Але сучасныя ўмовы, калі вёска паміраe, адбываецца перасяленьне яе жыхароў у гарады, губляецца сувязь паміж пакаленьнямі, і губляецца той цэментуючы матэрыял (фальклор, абрады, традыцыі), які да гэтага беларусаў зьвязваў у нацыю. Таму зараз, калі нацыянальная ідэя ў сучасным сьвеце адыходзіць у нябыт, на зьмену яе ідзе разуменьне грамадзянства, толькі мова зможа захаваць беларусаў як нацыю. Дый і практыка паказала, што зрусіфікаваныя беларусы пагубляліся на постсавецкай прасторы, і ўжо нават іх дзеці лічаць сябе рускімі, ці людзьмі іншай нацыянальнасьці, у залежнасьці ад таго, дзе яны апынуліся. І зараз уявім, калі б іх бацькі размаўлялі па-беларуску, то роднай мовай іх дзяцей стала б беларуская і, канешне, яны б сябе аднесьлі да беларусаў. **Таму ў сучасным сьвеце мова, а не этнічная прыналежнасьць, вырашаюць усё, асабліва для нацыяў зь нізкай нацыянальнай сьвядомасьцю. Таму са зьнікненьнем беларускай мовы – зьнікне і беларуская нацыя. І тое, што ўлада яе зьнішчае, сьведчыць аб тым, што яна хоча зьнішчыць ня мову, а беларусаў.**

Ад ТБК выступіў яе старшыня Хведар Нюнька. Ён зазначыў аб праблемах беларусаў Літвы. Праблемы, што прагучалі ў яго выступленьні, пераклікаліся зь іншымі дакладчыкамі. Гэта і тое, што беларусам няма ад каго чакаць дапамогі і тое, што адбываецца іх дэнацыналізацыя ня толькі ў замежжы, але і ў межах самой Рэспублікі Беларусь. У прыватнасьці ён зазначыў:

*„Ужо новае пакаленьне беларусаў Літвы пачало далучацца да мовы і культуры літоўскай, рускай, ці польскай, бо свайго не існавала. Заставалася горстка старэйшых нацыянальна сьведамых віленчукоў, што ў бальшыні вярнуліся са сталінскіх лагероў. Гэта яны ў часе гарбачоўскай адлігі спрычыніліся да адраджэньня і дзейнасьці беларускіх культурных арганізацыяў у Літве. Вось некаторыя з іх: Зоська Верас, Лявон Луцкевіч, Леванід Кароль, Мікола Рулінскі, Кастусь Шышэя, Аляксей Анішчык і другія. Нажаль, сёньня ў жывых іх нікога няма. /.../ Другія нац. меншасьці ў Літве маюць лепшыя ўмовы, бо за імі стаяць іх метраполіі. Таму і дасягненьні маюць значна большыя. Скажам, польскія суполкі атрымліваюць вялізарную дапамогу з боку Польшчы , ў тым ліку ад "Вспульноты польскай". Яны змаглі значна пашырыць сваю дзейнасьць ня толькі ў галіне культуры,бо на Віленшчыне дзейнічае звыш 100 польскіх школаў, але і на палітычным полі. /.../ Другая сытуацыя ёсьць у нашай Бацькаўшчыне Беларусі. На працягу звыш 10 гадоў ідзе зьніштажэньне беларускасьці, яе мовы, культуры і гісторыі. Чалавек зь беларускай мовай на вуліцы становіцца аб’ектам увагі стражаў парадку, альбо абразы з боку прыхільнікаў сталінізму. /.../ **У гарадох няма беларускіх школаў. Ва ўсёй рэспубліцы няма ніводнай беларускай ВНУ, не працуе беларуская царква. Не на прыкладах змаганьня беларускіх патрыётаў за Беларусь, ахвяруючы свабодай і жыцьцём, а на лініі Сталіна і помніках акупантам выхоўваецца моладзь.** Таму сёньня беларуская нацыянальнасьць не прэстыжная і па аддзельных раёнах Беларусі не беларусамі лічаць сябе да 80 % насельніцтва. Адсюль самі рабіце высновы пра магчымую будучыню Беларусі. Таму заклікаем спыніць ганеньне на беларускіх патрыётаў, каб выхаваць з моладзі дастойных грамадзян сваёй краіны“.*

У канцы зьезду быў прыняты шэраг рэзалюцыяў, датычных захаваньня беларускай нацыі ў XXI стагоддзі, а таксама адбыліся выбары кіруючых органаў. Новым старшынём „Бацькаўшчыны“ адзінагалосна была абраная Алена Макоўская. З чым яе шчыра віншуе ТБК.

Ня гледзячы на ўсё вышэй пералічанае, засталася надзея. Так, гісторыя сфальсіфікаваная, мова практычна зьнішчаная. Але... Яна жывая сярод тых беларусаў, якіх прэзідэнт краіны абразліва называе сьвядомымі. І перадусім яна жыве ў беларускіх дыяспарах, якія што раз нагадваюць, што беларусы ёсьць нацыя ня толькі зрусіфікаваных і з гісторыяй ад 1917 году., але гэта старажытная нацыя, пачынальнікамі якой былі князь полацкі Рагвалод, Рагнеда, Усяслаў Чарадзей, Еўфрасіньня Полацкая. Гэта значыць, яе вытокі ў сівой даўніне. Яе прадстаўнікі былі вядомыя на працягу свайго тысячагадовага існаваньня ва ўсім сьвеце. І тое, што сёньняшняя ўлада прыйшла да гэтых, з другой лініі Сталіна, так званых *сьвядомых,* і размаўляла з імі на мове, *на якой нельга выказаць вялікіх рэчаў*, сьведчаньне таго, што гэта акупацыйная ўлада прызнала ўрэшце існаваньне беларусаў, патэнцыял беларускай дыяспары і што зь імі трэба лічыцца.

*Алесь Адамковіч*, *Вільня*

21 ліпеня 2009г.

**Ніжэй падаем тэкст звароту сп Яўгена Мурашкі (Нямеччына), прачытанага на ягоную просьбу 19 ліпеня 2009 сп. Юркам Станкевічам, дэлегатам Зьезду ЗБС "Бацькаўшчына" ад дыяспары Чэхіі.**

# 5-му зьезду беларусаў сьвету

Паважаныя, суайчыньнікі, Зьвяз Беларусаў Нямеччыны, вітае вас на Бацькаўшчыне.

На вялікі жаль, прадстаўнікі нашай арганізацыыі ня маюць магчымасьці прысутнічаць у гэтай залі

. Аргкамітэт зьезду не запрасіў нас прыняць удзел у такой важнай для беларусаў замежжа падзеі, як сустрэча з суайчыньнікамі і нават ня прыслаў тлумачэньняў наконт адказу, хаця мы своечасова даслалі у аргкамітэт (сп. Ніне Шыдлоўскай) усе неабходныя паперы. Таму мы вымушаны прасіць дапамогі у паважанага Спадара Юркі Станкевіча, сябры Аргкамітэту па стварэньню Беларускага Міжнароднага Дэмакратычнага Руху, быць нашым зьвязуючым зьвяном паміж намі і дарагімі суайчыньнікамі.

ЗБН, ды ня толькі мы, неаднаразова зьвярталіся да кіраўніцтва МГА "Бацькаўшчыны" з прапановай правесьці зьезд па-за межамі Беларусі, бо беларускае замежжа Эўропы ня будзе дастаткова прадстаўлена на гэтым, важным для нас, форуме. Аднак зноў не атрымалі ад яго нават адказу. Вядома толькі адно, што кіраўніцтва арганізацыі спасылаецца на традыцыю правядзеньня зьездаў толькі на Беларусі.. Наколькі вядома, гэта традыцыя была закладзена да усталяваньня рэпрэсіўнага рэжыму ў Беларусі. Ва умовах дыктатуры, трэба новы падыход да рэальных абставін. Ні для каго ні сакрэт што за апошні час беларускае замежжа, асабліва Эўропы, папоўнілася новай хваляй палітычных уцекачоў, якіх рэжым выпіхнуў за межы Беларусі і зачыніў за імі браму у глухім плоце канцлягеру, у які ператварылі нашу Радзіму.

За сваю грамадзянскую і палітычную дзейнасьць, мы згубілі Радзіму, апынуўшыся за яе межамі, аднак мы ня згубілі сумленьня і не забыліся дзе мы нарадзіліся, дзе могілкі нашых продкаў і ў якім становішчы знаходзіцца наш беларускі народ. Тут, у замежжы, мы працягваем сваю дзейнасьць на карысьць нашай Беларусі. Мы ня лічым, што яна істотна зьменіць сітуацыю ў Беларусі, аднак наша сумленьне перад нашым народам чыстае. Можа гэта адна тысячная доля ад адсотка, аднак гэта наш унёсак у агульную беларускую справу.

На наш погляд, трэба адзначыць, што роля МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" , у гэтай справе магла бы быць больш значная. Аднак яна ня стала тым звязуючым зьвяном паміж Беларусьсю і замежжам. У выніковых дакумэнтах 3-га зьезду беларусаў сьвету (іншых крыніц у нас няма –Я.М.) шмат чаго дэкляравалася, аднак усе высілкі і выкананьне гэтых "мерапрыемстваў" былі накіраваны для дзеючай улады што зьяўляецца нонсэнсам. Улада робіць ўсё магчымае каб знішчыць нашу годнасьць а мы да яе зьвяртаюцца за дапамогай !?

У Рэзалюцыі 3-га зьезду ад 5-6 ліпеня 2001 года ёсьць такі запіс:

-"ухваляем намаганьні МГА "ЗБС "Бацькаўшчына" па арганізацыйным і духоўным яднаньні беларусаў свету, па наладжваньні сувязяў з грамадска-культурнымі суполкамі беларускага замежжа і аказаньні ім усебаковай дапамогі."

-"Выказваемся за арганізацыйнае і ідэйнае адзінства беларускага руху."

Адчыняем сайт "Бацькаўшчыны" там ёсьць пералік 169 беларускіх суполак з 21 краіны, аднак адсутнічае база дадзенных для сувязі. Чаму "Бацькаўшчына" трымае гэтыя адрэсы толькі для сябе? Што за манаполія на інфармацыю? Няхай, на сёньняшні дзень іх напалову менш, аднак, калі іх зьвязаць у адно інфармацыйнае кола атрымоўваецца вельмі вялікі патэнцыял для дзейнасьці на карысьць беларускай нацыянальнай ідэі.

Трэба зрабіць адзіны механізм для сінхроннай працы. Чаму кіраўніцтва "Бацькаўшчыны" само гэта не робіць і нам такой магчымасьці не дае? Кіраўнік Рады, сп. А.Макоўская не адказвае нават на нашы лісты. Што гэта? Палоханьне таго, што улады западозраць іх у сувязі з палітычнымі апанентамі, ці проста жаданьне спакойна сядзець і рабіць выгляд нейкай дзейнасьці?

Мы, таксама прасілі унесьці у каталаг МГА "Бацькаўшчыны" нашы сайты, аднак, іх там дагэтуль няма.

Што бы гэта ня было аднак, такая пазіцыя сёньнешняга кіраўніцтва ня спрыяе дэмакратычным зьменам у Беларусі.

З 1996 году ў Беларусі мае месца палітычны крызіс. Лукашэнка зьдзейсьніў дзяржаўны пераварот і дагэтуль гвалтоўна утрымлівае уладу якая застаецца нелегітымнай, пры тым, ня толькі пры маўклівай згодзе Эўропы а па некаторых пазіцыях - паразуменьня і дыялогу.

Як прыклад праграма "Усходняга партнэрства", якая, дарэчы ва умовах фінансавага крызісу, прыпыніла сваю дзейнасьць. І добра, бо яна, акрамя пэўных людзей ва уладзе і апазыцыйных колах, для беларускага народу ня прыносіць ніякай карысьці. За гэты час апаненты рэжыму, так званая "апазыцыя", ня здолелі ды, менавіта і ня здолеюць, зрабіць нейкія дэмакратычныя пераўтварэньні, бо гэта не стаіць у іх на мэце, у іх свае прагматычныя інтарэсы.

У такіх абставінах МГА"Бацькаўшчына" магла бы стаць на пазіцыі актыўнага змаганьня за беларускую нацыянальную ідэю, тым рухавіком, які б абапіраўся, у сваёй дзейнасьці, на беларускае замежжа з аднаго боку і на грамадскія арганізацыі ў Беларусі.

Так давайце аб'яднаем нашы намаганьні у гэтай барацьбе і вынік будзе!

І калі ужо казаць пра выніковыя дакумэнты, то трэба шчыра сказаць – яны не вытрымліваюць ніякай крытыкі.

**Па першае:**

Яны, амаль што, передрукованы з матар'ялаў 3-га зьезду і дагэтуль ня выкананы.

**Па другое:**

Надрукаваны языком савецкіх часоў, бяз уліку сёньнешняй палітычнай сітуацыі у Беларусі і у сьвеце, таму:

Прапануем прыняць іх за падмурак і з улікам дапаўненьняў ці зьменаў і даручыць Радзе прыняць іх цалкам.

ЗБН, пакуль ня можа нічога прапанаваць у гэтыя дакумэнты, бо невядома якую пазіцыю зойме зьезд.

Калі зьезд беларусаў сьвету прыме рашэньне распачаць актыўную дзейнасьць, супраць генацыду і этнацыду беларускага народу, дзеля усталяваньня дэмакратыі

ў Беларусі, палітычныя уцекачы Зьвязу Беларусаў Нямеччыны і Аркамітэт па стварэньню Беларускага Міжнароднага Дэмакратычнага Руху, прыкладуць ўсе намаганьні, каб быць карыснымі ў гэтай цяжкай працы

З павагай да кіраўніцтва МГА “Бацькаўшчына” і нашых суаайчыньнікаў, дэлегатаў зьезду.

Жыве Беларусь!

Яўген Мурашка, старшыня Зьвязу Беларусаў Нямеччыны.

Для сувязі:

Е-маіл: zbn42@mail.ru тэл 0049 871 276 59 04

14.07.09

## УРАЖАНЬНІ й НАЗІРАНЬНІ

*зь ліпеньскага падарожжа на Радзіму*

Найбольш уражвае (асабліва ў Менску) тое, да якой ступені ў сучаснай Беларусі культура й мова карэннае беларускае нацыі была выцісьненая за борт - на ўскраіну публічнага жыцьця.

Крыўдна гэта сьцьвердзіць, але здаецца, што бальшыня насельніцтва прывыкла да «каланіяльнай» атмасфэры, калі ў штодзённым публічным жыцьці пануе духова пусты камплекс таннай спажывецкасьці - і амаль усюды чуеш чужую мову.

Здаецца, што гэтая бальшыня ўспрымае культуру й мову карэннае (і роднае) беларускае нацыі як музэйную спадчыну мясцовых «тубыльцаў.»

Праўда, ня ўсе гэтак думаюць, але часта ня хочуць, або баяцца на гэтую тэму выказвацца.

Цяжка гэтых людзей крытыкаваць, бо (наколькі мне ведама) ужо ад 50-тых гадоў мінулага стагодзьдзя (а можа й раней) пануючы рэжым праводзіў сыстэматычную кампанію паніжаньня беларускае мовы й культуры і паступовага выцісканьня іх з публічнага жыцьця.

Да таго-ж у мінулым стагодзьдзі у Беларусі адбыўся імклівы працэс урбанізацыі - калі новым гарадзкім жыхаром - выхадцам зь беларускіх вёсак - рэкамэндавалі гарадзкую «цывілізацыю», разам з «усесаюзнай» расейскай культурай.

Сёньняшні рэжым гэты «ідэал» яшчэ ўдасканаліў, дадаўшы да яго здабыткі глябалізацыі — замежныя тавары й сучасную электроніку.

Адначасна кідаецца ў вочы фэнамэн павярхоўнага, сымбалічнага ўжываньня беларускае мовы у (некаторых ) афіцыйных заявах, у гарадзкім транспарце, на дарожных і вулічных паказьніках.

Сярод мясцовых беларусаў прыжылося трапнае акрэсьленьне гэтага фэнамэну: **АДЧЭПНАЕ**.

Пры наведаньні новай нацыянальнай бібліятэкі ў Менску давялося мне пазнаць вышэйшы ступень «адчэпнага». У бібліятэцы ўсе напісы па-беларуску, але набыць беларуска-моўную інфармацыю пра будынак бібліятэкі немагчыма - ні ў сусьветных мовах (прыкл. ангельскай). Праўда, інфармацыя ёсьць - па-расейску.



*Нацыянальная бібліятэка ў Менску*

Усё-ж такі, сам будынак бібліятэкі трэба пахваліць, як з гледзішча архітэктуры, так і супер-мадэрнага функцыянаваньня. Напэўна перапрывае яшчэ не адзін рэжым...

Хаця мае назіраньні й прапановы ня новыя, але магчыма змогуць паслужыць як штуршок да выпраўленьня сытуацыі.

Некаторыя іншыя народы ужо знайшлі эфэктыўны выхад з падобных абставінаў.

Вось стрыжань філязофіі патрэбных рэформаў:

— Трэба падняць **АЎТАРЫТЭТ** карэннае беларускае мовы - пашану, рэспэкт да яе.

— не здаволіцца толькі афіцыйным прызнаньнем унікальнае мінуўшчыны Беларусі - за кошт выцісьненьня роднае культуры й мовы з сучаснага жыцьця 21-га стагодзьдзя.

Вось мае канкрэтныя прапановы:

* 1). Увесьці **абавязкавае навучаньне роднае мовы на ўсіх узроўнях школьніцтва**. Гэта асабліва важна ў першых клясах і дзіцячым садку.

Маладыя бацькі гэтых дзяцей яшчэ разумеюць родную мову, хаця часта ёю не карыстаюцца. Затое іхным дзецям яна стала **чужой**, бо ня чуюць яе ні ў школе, ні на вуліцы, ні на тэлебачаньні...

Пасьля азнаямленьня з роднай мовай у першых клясах можна будзе паступова перайсьці на навучаньне ўсіх прадметаў **на роднай мове.**

— Мовы суседніх народаў змогуць дзеці вывучаць дадаткова, на просьбу бацькоў.

* 2). Хай і паступова, але ўводзіць навучаньне на роднай мове у Вышэйшых Навучальных Установах ( ВНУ).

* 3). Увесьці аб'явы ( на пісьме й голасам) на роднай мове у публічных установах і гандлёвых прадпрыемствах і на публічных плякатах - не замест расейскамоўных, але побач зь імі. Гэта й будзе справядлівае дзьвюхмоўе.

* 4). Інструкцыі ды этыкеты спажывецкіх тавараў павінны друкавацца ў 2-х дзяржаўных мовах.

* 5). Урадоўцы дзяржаўных установаў павінны выказаць валоданьне беларускай мовай - прынамсі разуменьне , або лепш - здольнасьць адказаць на пытаньні.

— увесьці адмысловыя курсы беларускае мовы для ўрадоўцаў.

* 6). Забясьпечыць выдавецтва й распаўсюд штодзённае беларуска-моўнае прэсы - дзяржаўнае й недзяржаўнае.

* 7). Забясьпечыць беларускамоўнае вяшчаньне на тэлебачаньні - пачынаючы з аднае цалкам беларуска-моўнае станцыі.

* 8). Увесьці дубляваньне замежных фільмаў на беларускую мову - у кінотэатрах і на тэлебачаньні.

На добры лад усе гэтыя крокі павінны быць абавязкам **нацыянальнае па духу** дзяржавы.

У здаровым грамадзтве выкананьня гэтых рэформаў могуць дамагацца грамадзкія арганізацыі.

Яны-ж могуць зьвярнуцца з просьбай аб канкрэтную дапамогу за мяжу (прыкл. да Эўразьвязу), інфармуючы, што ў Беларусі адбываецца сыстэматычны **КУЛЬТУРНЫ ЭТНАЦЫД**, які можа давесьці да зьнішчэньня аднае з карэнных эўрапэйскіх нацыяў.

*Рэдактар*.

**Да ведама чытачоў:**

Цікавы артыкул Др. Янкі Запрудніка(ЗША) на гэтую-ж тэму знойдзеце на:

- старонцы Радыё Свабода - **“Нататкі з падарожжа,”** і на старонцы Нашай Нівы - **“Беларусь вачыма амэрыканца”** - 19-га жніўня 2009

## Лукашэнка пра 991: Навошта ўзьнялі на дыбкі ўсю краіну?

Пастанова № 991 супярэчыла палітыцы лібэралізацыі эканамічнай дзейнасьці, якая праводзіцца ў Беларусі, лічыць Аляксандар Лукашэнка.

Як паведамілі агенцтву “Інтэрфакс-Захад” у прэс-службе кіраўніка дзяржавы, прэзыдэнт раскрытыкаваў гэты дакумэнт у часе нарады па пытаньнях дзейнасьці органаў пракуратуры.

“Для мяне важныя паказьнікі эфэктыўнасьці. У эканоміцы — гэта прыбытак і рэнтабэльнасьць. Вось, да прыкладу, нядаўна выпусьцілі пастанову № 991 „Пра некаторыя пытаньні набыцьця тавараў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусі“ й фактычна забаранілі суб’ектам гаспадараньня гандляваць”

“Ды хай кіраўнік сам вырашае, як дзейнічаць, а спаганяць трэба за прыбытак і рэнтабэльнасьць! Навошта камусьці ўказваць, з кім гандляваць, працаваць з пасярэднікамі ці не?”, — пераказалі словы прэзыдэнта ў прэсавай службе.

“Сталі разьбірацца, хто пастанову рыхтаваў. Аказалася, адзін „дзяяч“ па ўказцы прэм’ер-міністра падрыхтаваў гэты дакумэнт, кінуў яму на стол і назаўтра зьехаў у адпачынак. Спагнаць нават няма з каго!”

“Так, пасярэдніцтва — гэта кепска, і мы мусім яго пазьбягаць. Але зь якой мэтай? Каб цана была ніжэйшай, а якасьць — добрая. Навошта ўзьнялі на дыбкі ўсю краіну? Гэта справа прыватніка, дзе й як закупляць, ён жа разумее, што гэта ягоныя грошы, ён ніколі ня купіць даражэй і з горшай якасьцю”.

Інакш паўстаюць пытаньні, дзе ж тая лібэралізацыя эканамічнай дзейнасьці, пра якую мы гаворым?

“Значыць, пытаньні да дзяржаўных прадпрыемстваў. Дык давайце паставім задачы, а потым — праз месяц праверым, вінаватыя адкажуць. Вось і ўсё, і ня трэба ніякага шуму”.

“Інакш паўстаюць пытаньні, дзе ж тая лібэралізацыя эканамічнай дзейнасьці, пра якую мы гаворым, дзе самастойнасьць кіраўніка, калі мы яму пішам, што ў каго купіць. Хай ён сам разьбіраецца, а нашая задача даць прававую й іншую ацэнку кіраўніку, які адказвае за вытворчасьць. Вось як трэба дзейнічаць, а ня фронтам хадзіць па краіне”.

Паводле прэс-службы, “Аляксандар Лукашэнка яшчэ раз выказаў сваё жорсткае патрабаваньне выключыць неабгрунтаваныя праверкі”.

“Калі хтосьці пагарджае законам — прыцягвайце да адказнасьці. Але ісьці з праверкамі трэба толькі туды, дзе ёсьць за што зачапіцца, ніякіх „авось за што-небудзь зачэпімся“ быць ня мусіць. Інакш узьнікае падазрэньне: чаго туды пайшоў, можа, з кімсь рахавацца? Ці дапамагчы камусь з канкурэнтам змагацца? Ці дашукваецеся, што ў кішэню пакласьці?”

“Калі ў прадпрыемства добры прыбытак і рэнтабэльнасьць, туды з праверкамі ўвогуле хадзіць ня трэба. Інакш гэта падразае ініцыятыву людзей. Калі ісьці — то толькі за досьведам”.

**Крыніца:** Радыё Свабода (Менск), 6 жніўня 2009

##Ператрус у кватэры актывіста партыі БХД

У кватэры сябры аргкамітэту па стварэньні Партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя Юрыя Жылко канфіскоўваюць літаратуру.

У інтэрв'ю «Радыё Свабода» актывіст «Маладога фронту» Павал Красоўскі паведаміў, што сам Юры Жылко зьехаў на заробкі і пакінуў яму даверанасьць на распараджэньне кватэрай.

Супрацоўнікі міліцыі паказалі Красоўскаму ордэр «на агляд кватэры», падпісаны жодзінскім пракурорам. Яны сказалі, што, паводле іх аператыўных звестак, у кватэры ёсць наркатычныя рэчывы ці рэчывы, якія ўтрымліваюць спірт.

Аднак на самой справе супрацоўнікі міліцыі адразу ж сталі шукаць літаратуру і забралі шэраг інфармацыйных матар’ялаў, сярод якіх бюлетэні БХД.

На пытаньне, у межах якой крымінальнай справы дзейнічаюць супрацоўнікі міліцыі, яны адказваць адмовіліся.

Павал Красоўскі паведаміў, што раніцай у кватэру Юрыя Жылко спрабавалі зайсьці людзі ў цывільным. Яны адчынілі дзьверы нейкім прыстасаваннем, але, зайшоўшы ў кватэру, убачылі Красоўскага і адразу ж сышлі.

**Крыніца:** Хартыя 97, 6 жніўня 2009

## Славутая «Купалінка», або Гісторыя аднаго замоўчваньня

**Максім Іўкін**

Яшчэ ў далёкім 1964 г. выдатны айчынны вучоны Арсень Ліс закрануў у друку пытаньне аўтарства "народнай" песьні "Зорка Венера" на верш М. Багдановіча ("Маладосць", 1964, № 5). І сёньня, як вынік шматгадовае працы па вяртаньні ў навуковы і культурны кантэкст незаслужана забытага імя, С. Рак-Міхайлоўскі як кампазітар гэтага рамансу згадваецца ўжо ўпэўнена і без агаворак. Песьня "Люблю наш край" на словы К. Буйло яшчэ ў другім выданьні шырокавядомай "Анталогіі беларускай народнай песьні" Г. Цітовіча (1975) зьмяшчалася як ананімны музычны эпіграф да зборніка, з пазначэньнем адно аўтарства слоў і часу стварэньня (цікава, што першакрыніцай яе публікацыі, як дарэчы, і публікацыі зьмешчанай тамсама "Купалінкі", пазначаныя ў "Анталогіі" "Песьні беларускага народа" (1959) самога ж Г. Цітовіча). Але ўжо ў даведніку "Кампазітары Беларусі" (1997), у артыкуле пра М. Равенскага, сьцьвярджаецца: "М. Равенскі стварыў шэраг глыбока нацыянальных твораў, сярод якіх песьня "Люблю наш край" (мэлодыя яе вядомая ў Беларусі як народная)".

Былі ў той ананімнасьці і іншыя прычыны, апроч шырокай распаўсюджанасьці песень і народнай да іх любові. Сёньня ўжо не сакрэт, што і Сымон Рак-Міхайлоўскі, рэпрэсіраваны ў 1938 годзе, і Мікола Равенскі, абвешчаны калабарацыяністам толькі за тое, што падчас Другой сусьветнай не пакідаў межы радзімы, надоўга былі проста выкрасьленыя з афіцыйнай гісторыі беларускай культуры. Такі ж лёс напаткаў і Уладзіміра Тэраўскага (1871 — расстраляны ў 1938) — знакавую постаць беларускай музыкі, чалавека, які стаяў ля вытокаў стварэньня нацыянальнай опэры і нацыянальнай музычнай школы. Самастойна авалодаўшы неабходнымі прафесійнымі ведамі, "ён стаўся першым беларускім кампазітарам, які паказаў дарогу беларускай прафесійнай музычнай творчасьці" і "паклаў асновы тых метадаў, паводле якіх апрацоўвалася беларуская народная песеннасьць ды пісаліся арыгінальныя беларускія творы" (М. Травень).

У гісторыі беларускай культуры У. Тэраўскі, колішні ўдзельнік славутага хору Агрэнева-Славянскага, вядомы найперш як стваральнік нацыянальных хораў — першы беларускі хор быў арганізаваны ім яшчэ перад Першай сусьветнай вайной (увогуле ж дырыжыраваць хорам У. Тэраўскі пачаў яшчэ ў 16—17-гадовым узросьце). У розныя часы славуты беларускі хор пад яго кіраўніцтвам уваходзіў у склад першага таварыства беларускай драмы і камедыі, Дзяржаўнага тэатра БНР, Беларускага савецкага тэатру, выступаў самастойна, заўсёды нясучы ў масы ідэю унікальнасьці беларускага нацыянальнага мастацтва.

Частка песенных стылізацый і г. зв. "новых песень у беларускім характары" У. Тэраўскага друкавалася ў зборніках "Беларускі сьпеўнік" (Менск, 1921, 25 узораў), "Беларускі лірнік" (Берлін, 1922, 99 узораў) і "Вайсковы зборнік" (Менск, 1926, 30 узораў). Цікавым і вельмі істотным тут момантам падаецца тое, што ў адрозьненьне ад згаданых мною песень М. Равенскага і С. Рака-Міхайлоўскага "новыя песьні" У. Тэраўскага ствараліся ня толькі на словы вядомых паэтаў і драматургаў (Янкі Купалы, Ф. Аляхновіча, В. Дуніна-Марцінкевіча), але і на аўтэнтычныя народныя тэксты. І ўсё-ткі важнасьць і колькасьць зробленага У. Тэраўскім на ніве стварэньня нацыянальнага музычнага рэпертуару не ўратавала яго ад рэпрэсій з боку савецкай улады. Выхад у сьвет другога з названых сьпеўнікаў Тэраўскі сустрэў за кратамі смаленскай турмы, адбываючы там пакараньне, на якое быў заменены папярэдне вынесены яму "за антысавецкую дзейнасьць" прысуд да расстрэлу.

Пад рэпрэсіі трапілі тады і некаторыя творы кампазітара, найперш "Ваяцкі марш" на словы Макара Краўцова, які выкарыстоўваўся ў якасьці гімну Беларускай Народнай Рэспублікі. Калі ў "беларускім сьпеўніку" 1921 г. (рыхтаваным яшчэ пры паляках, але выдадзеным ужо за саветамі) ён займаў цэнтральнае месца, адно са зьмененымі словамі, то ў наступным — "Беларускім лірніку" (1922) — яго, мяркую, увогуле зьнялі з падрыхтаванага ўжо да друку варыянту (думаецца, "Ваяцкі марш" зьмяшчаўся ў ім пад № 100, бо першыя два нумары — гэта гарманізаваныя Тэраўскім "Інтэрнацыянал" і "А хто там ідзе?" Л. Рагоўскага, а апошні — № 99 — гарманізацыя "Беларускай марсельезы"). Дарэчы, акурат у 1922 г. была створаная арганізацыя, якая аб'яднала ўсе віды цэнзуры: Галоўнае ўпраўленьне па справах літаратуры і выдавецтваў, у Беларусі — Галоўлітбел. Паказальным для дзейнасьці гэтай арганізацыі зьяўляецца, да прыкладу, рашэньне Галоўлітбела ад 29.11.1932 г. "Об изъятии из продажи и музыкальных библиотек народных песен с нотами "А ў бары", "А ў лесе, лесе", "Мужык жыта прадае", а также песен на слова Янки Купалы "Лісты валяцца", "У імгле" и Максима Богдановича "Як прыйшла я на ток малаціць". Дарэчы, шырока папулярныя апрацоўкі Тэраўскага "А ў бары, бары" і "А ў лесе" таксама зьмяшчаліся ў ягоных зборніках.

Адным з найбольш і па сёння папулярных зборнікаў беларускіх народных песень зьяўляецца "Анталогія беларускай народнай песьні" Генадзя Цітовіча, выдадзеная ў 1968-м і перавыдадзеная — у дапоўненым выглядзе — у 1975 г. У падраздзеле "Каляндарна-абрадавыя песні" раздзелу "Песні дасавецкага перыяду" абодвух выданьняў зьмешчаная і славутая беларуская "Купалінка" — "напеў навейшага паходжаньня, аб чым гаворыць яго інтанацыйная пабудова, якая адрозьніваецца ад традыцыйнай мелодыкі купальскіх песень, і многагалосьсе", як сьцьвярджаецца ў каментарыях складальніка пры канцы кнігі.

*Паводле дакладу, прачытанага аўтарам 8. 04. 2008 г. на XVII Навуковых чытаньнях памяці Л. Мухарынскай у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі.*

**Крыніца:** *Літаратура і Мастацтва*, 3 красавіка, 2009

*Працяг у наступным нумары КРЫВІІ.*

## “Рашэньне аб закрыцьці беларускіх праграмаў было няпростым”

“Наша рашэньне — ані лёгкае, ані камфортнае”, — заявіў адзін з кіраўнікоў SR International Інгэмар Лёфгрэн у адказ на шматлікія крытычныя выказваньні швэдзкіх палітыкаў і грамадзкасьці ў сувязі з закрыцьцём беларускіх праграм Радыё Швэцыя ад 1 верасьня.

Паводле кіраўніцтва радыё, сёньня да замежнага вяшчаньня трэба падыходзіць больш рацыянальна, у тым ліку — “імкнуцца выкарыстоўваць адну мову для некалькіх краін”. Што да рэгіёну былога СССР, то тут, лічаць на SR International, расейская мова цалкам зразумелая.

Сёньня SR, акрамя расейскамоўных праграм, працягвае рабіць перадачы на ангельскай, альбанскай, арабскай, нямецкай, пэрсыдзкай, курдзкай, сырыйскай, басьнійскай, сэрбскай, харвацкай і некаторых іншых мовах.

## “Бацькаўшчына” патрабуе, каб Лёфгрэн выбачыўся

Міжнароднае грамадзкае аб'яднаньне "Згуртаваньне беларусаў сьвету "Бацькаўшчына" патрабуе ад кіраўніка міжнароднага каналу Швэдзкага радыё Інгэмара Лёфгрэна прынесьці афіцыйнае прабачэньне за яго словы, паведамляе БелаПАН.

Выказванне, на думку МГА "ЗБС "Бацькаўшчына", складаецца з "глыбока некарэктных параўнаньняў, якія сьведчаць пра татальнае неразуменьне сытуацыі ў Рэспубліцы Беларусь". "Посткаляніяльнае бачаньне сьвету спадаром Лёфгрэнам ня можа ня выклікаць здзіўленьня і абурэньня дэмакратычнай супольнасьці", — гаворыцца ў звароце.

"Бацькаўшчына" патрабуе паважлівага стаўленьня да роднай мовы тытульнай нацыі Беларусі і настойвае на працягу вяшчаньня па-беларуску пасьля 1 верасьня.

**Крыніца:** Радыё Свабода (Менск), 5-6 .8.2009

## Лукашэнка: «З 2011 году будзем жыць як у Эўропе»

*Але спачатку толькі ў сьвінагадоўлі і будаўніцтве.*

У сьвінагадоўчай галіне Беларусі пачынаецца рэвалюцыя, заявіў кіраўнік Беларусі. Паводле яго, тры гады таму некалькі заходніх інвэстараў прапанавалі рэалізаваць у Беларусі праекты па сьвінагадоўлі. Адзін комплекс, разьлічаны на ўтрыманьне 25 тысячаў галоў, быў пабудаваны ў Магілёўскай вобласьці па галяндзкіх тэхналёгіях. У Ляхавіцкім раёне створаны сьвінакомплекс па тэхналёгіях датчан. «Мы атрымалі самыя сучасныя сьвінакомплексы ў сьвеце, і цяпер ёсьць узор, каб навучыць астатніх у Беларусі. На гэтых пілотных праектах мы навучыліся, як будаваць, ствараць новыя канструкцыі. Такім чынам, мы будзем перабудоўваць усю краіну ў гэтай галіне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Беларуская сельская гаспадарка будзе даведзена да стандартаў сусьветнага ўзроўню, заявіў таксама кіраўнік Беларусі пасьля наведваньня сьвінакомплексу беларуска-дацкага ЗТАА «Белдан».

Ён падкрэсьліў, што такія комплексы неабходна паступова ўкараняць ва ўсёй рэспубліцы:

«Вось узор. Нам трэба вызначыцца, колькі комплексаў неабходна ў рэгіёнах, і паступова рэканструяваць старыя і ствараць такія сучасныя



комплексы. Нічога прыдумляць ня трэба, мы ўжо бяром гатовыя тэхналёгіі. Сёньня іх трэба «выцягваць» з Эўропы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што ў гэтым станоўчыя рысы сусьветнага крызісу, які садзейнічае таму, што эўрапэйцы ідуць працаваць у новыя для сябе рэгіёны.

Ён таксама падкрэсьліў, што да 1 студзеня 2010 году поўнасьцю на эўрапейскія нормы выйдзе будаўнічая галіна. «З 2011 года, я ўпэўнены, мы будзем жыць, як у Эўропе, падцягнуўшы і іншыя напрамкі», — сказаў ён.

Аляксандар Лукашэнка сярод іншага гаварыў пра эфэктыўнасьць перапрацоўкі саломы. «Ня дай Бог, вы не папрацуеце з саломай, будзеце яе спальваць або пакідаць безгаспадарнай на палях. Тады наракайце самі на сябе, — сказаў ён. — Навошта вы яе зьбіраеце на палях? Растрасіце яе, унясіце калій і азот. Калі мы цяпер своечасова ўнясём гэта ўгнаеньне, тады ў нас будуць разьвязаны рукі вясной», — дадаў Лукашэнка.

**Крыніца:** БЕЛТА + Радыё Свабода, 7 жніўня 2009

## Беларусь у сьвеце

## Адкрыты ліст прэзідэнту ЗША Бараку Абаму

*З краіны Усходняй Еўропы, якая ня ўваходзіць у НАТА і ЭЗ*

Спадар Прэзідэнт!

16 ліпеня 2009 года польская газета «Gazeta Wyborcza» апублікавала ліст да Вашай адміністрацыі, які падымае ключавыя пытаньні Еўраатлантычнага партнёрства. Яго падпісалі 22 чалавекі, якія зьяўляюцца элітай зьнешняй палітыкі і бясьпекі краінаў-новых чальцоў НАТА і ЕЗ, інтэлектуалы Усходняй і Цэнтральнай Эўропы.

Наўпрост ці ўскосна ўсе пытаньні, якія яны закранулі, датычаць дынамікі бягучых і, верагодна, будучых падзеяў у іх рэгіёне Эўропы, датычных адносінаў з Расеяй. Яны заклікаюць Злучаныя Штаты да ўдзелу ў сітуацыі і супрацоўніцтве ў якасьці сапраўднага партнёра Еўропы, заклікаюць выступаць адносна праблемаў рэгіёну - пераканаўча, выразна і сваечасова.

На жаль, у напісаньні гэтага ліста ня ўдзельнічалі, або, прынамсі, яго не падпісалі, іх калегі з тых усходнееўрапэйскіх краінаў - Арменіі, Азербайджану, Беларусі, Грузіі, Малдовы і Украіны - якія пакуль не зьяўляюцца чальцамі НАТА і ЕЗ і ня маюць адпаведных гарантыяў бясьпекі. Не выпадкова, што гэта тыя эўрапэйскія краіны, якія бліжэй за ўсё да Расеі, і тыя, у каго самы працяглы досьвед жыцьця пры савецкім расейскім камунізьме. Гэты досьвед зьяўляецца асабліва важным зараз, у кантэксьце апошніх падзеяў і тэндэнцыяў.

Усе пытаньні, узьнятыя аўтарамі адкрытага ліста, надрукаванага ў Gazeta Wyborcza, і шмат, шмат якія іншыя, самым непасрэдным чынам датычаць нашых краінаў. Расейска-грузінскі канфлікт летась, бяз сумневу, найбольш відавочная дэманстрацыя гэтага факту. Але наўрад ці адзіная.

Эканамічны шантаж Масквы ў дачыненьні да Беларусі, Малдовы і Украіны з мэтай прымусіць іх вярнуцца ў сфэру ўплыву Крамля зь яго рэвізіяністцкай палітыкай, зьяўляецца менш вядомай, але ня менш рэальнай пагрозай для іх будучыні. Перыядычны энергетычны шантаж Расеяй усіх гэтых шасьці краінаў стаў нормай у першым дзесяцігоддзі 21 стагоддзя.

З-за доўгага дамінаваньня, спачатку Расеі, затым Савецкага Саюзу нашая радзіма Беларусь -- гэта асаблівы выпадак і ёй трэба надаць асаблівую ўвагу. Мы бачым, што сукупнасьць фактараў у сучаснасьці - эканамічных, палітычных, у сфэры бясьпекі - можа быць шматабяцальнай для "пераменаў, у якія мы можам верыць", якія абвесьціла вашая адміністрацыя, і якія захапілі ўяўленьне людзей ва ўсім сьвеце.

ЭЗ з ухвальнай мудрасьцю адказаў на пераменлівыя рэаліі Усходняй Еўропы, у прыватнасьці, ініцыятывай Усходняе Партнёрства. Зараз мы заклікаем ЗША далучыцца да яго з такой жа дальнабачнасьцю і энергіяй. З ўсіх прычынаў, пазначаных падпісантамі Адкрытага ліста ад 16 ліпеня, якія яны бачаць зь іх выйгрышнай пазіцыі чальцоў НАТА і ЭЗ, мы таксама заклікаем ЗША скарыстацца магчымасьцямі, якія пакуль ёсьць. З пазіцыі краінаў, якія знаходзяцца па-за межамі гэтых арганізацыяў, мы можам прапанаваць шмат што. І нашыя патрэбы таксама вялікія. Мы чакаем ад Амэрыкі, гэтак жа як і ад Эўропы, мудрасьці і мужнасьці, якія так неабходныя ў наш час.

*Станіслаў Шушкевіч, экс-спікер беларускага парламенту, першы кіраўнік Рэспублікі Беларусь*

*Івонка Сурвіла, Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі ў выгнаньні*

**Крыніца:** Хартыя 97, 5 жніўня 2009

# СПОРТ

## Гакейны чэмпіянат сьвету, Швайцарыя, травень 2009

**Зборная Беларусі заняла на турніры 8-е месца.**

**Андрэй Мезін** - найлепшы брамнік чэмпіянату сьвету

Подзьвігі беларускага брамніка былі ацэненыя ня толькі дырэктаратам пяршынства, але і журналістамі, што ўключылі Андрэя ў сімвалічную зборную зорак чэмпіянату.

Мезін абараняў браму зборнай Беларусі ў пяці матчах з сямі. У гэтых матчах наша каманда выйграла па булітах у славакаў — 2:1 і фінаў — 2:1, у овертайме ў нарвежцаў — 3:2, перамагла венграў — 3:1 і саступіла ў чвэрцьфінале расіянам, будучым чэмпіёнам сьвету, — 3:4.

Андрэй Мезін адбіў 163 кідкі з 172 (сярэдняя прапускальнасьць 1,72 шайбы за матч). Яго адсотак надзейнасьці склаў 94,77%.

**Крыніца:** *Наша Ніва*, 11 травень 2009.

## БЕЛАРУСЬ - сусьветная сіла ў байдарачным спорце

У сусьветным чэмпіянаце хуткаснага веславаньня, што адбыўся ў Канадзе ў жніўні 2009 г., беларускія весьляры здабылі шэраг першых месцаў:



у катэгорыях **K4 на 1000 і 200м., K2 на 500 і 200 м** (Пятрушэнка, Махнёў, Турчын, Валько, Абалмасаў)

у катэгорыях **C1 на 500 м., C2, і C4 на 1000 і 200м** (Гаража, Рабчанка, Ваўчэцкі, браты Андрэй і Аляксандр Багдановічы)

# Беларусы Эўразьвязу

## Аляксандр Рыбак — пераможца

23-гадовы ўраджэнец Беларусі Аляксандр Рыбак, які пражывае ў Нарвэгіі, стаў пераможцам 54-га міжнароднага конкурсу песьні "Еўрабачаньне-2009", які адбыўся ў Маскве. З кампазіцыяй уласнага сачыненьня Fairytale ("Казка") нарвэскі беларус заняў першае месца, набраўшы 387 балаў.

На другім месцы Ісландыя (218), на трэцім — Азербайджан (207), на чацьвёртым — Турцыя (177), на пятым — Вялікабрытанія (173).

У "Еўрабачаньні-2009" узялі ўдзел выканаўцы з 42 краін.

**Крыніца:** Радыё Рацыя, 17.5.2009



## Сяржук Сокалаў-Воюш пераклаў песьню Рыбака

Тэкст + музыка.

**Fairytale**

Ведаў я адну дзяўчыну
З тых часоў прайшлі гады
Мы плылі у аблачынах
Хоць даўно… Ды сапраўды…
Ў казку я закаханы зноў
Гэты боль здавён
Можа быць звар’яцелы я
Бо на мне праклён.
Сваркі ўдзень, каханьне ўночы
Так ніхто, ніколі, не
Мне журбой ня поўніў вочы,
Так ня нёс у рай мяне.
Ў казку я закаханы зноў
Гэты боль здавён
Можа быць звар’яцелы я
Бо на мне праклён.
Ростань лёс прынёс раптоўна
Я прысьпешваю хаду
Каб усё пачаць ізноў нам
Як знайду, цябе знайду.
Ў казку я закаханы зноў
Гэты боль здавён
Можа быць звар’яцелы я
Бо на мне праклён.
А яна — казка, гэта так
І мой боль здавён
Можа быць звар’яцелы я
Бо на мне праклён.

**Крыніца:** sokalau-vojus.livejournal.com

---

## Дні беларускай культуры ў Познані

8-12 чэрвеня 2009 у Познані адбыліся чарговыя дні беларускай культуры. Ніжэй далучаны плякат і дакладны плян мерапрыемстваў:

Першы Дзень (08.06.2009).
а) Лекцыя док. Івана Пешкова
“Трансфармацыя без рэструктурызацыі. Мадэль рэфармаваньня эканомікі Беларусі.”
б) Вечар беларускай паэзіі

Другі Дзень (09.06.2009).
а) Лекцыя док. Марэка Фігуры “Беларусь паміж Усходам і Захадам”
б) Канцэрт беларускай музыкі
выступ гурту Стары Ольса

Трэці Дзень (10.06.2009).
а) Лекцыя док. Марыюша Маршэўскага
“Праблема інтэграцыі Беларусі ў структуры Еўрапейскага Зьвязу. Перспектывы Усходняга Партнэрства.”
б) Прэзэнтацыя фільмаў “Дзікае паляваньне караля Стаха” і “Колер каханьня”
в) Вечар клубнай музыкі
(запрошаныя дыджэі Andersen і Derevce Ska зь Беларусі)




**КРЫВІЯ - Культурна-асьветніцкая газэта**
Выданьне беларускай дыяспары ў Чэхіі
MK ČR E 16919
РЭДАКЦЫЯ
Юрка Станкевіч
Ганна Васілевіч
Адрас рэдакцыі:
ul. Ostrovského 253/3, 150 00 Praha 5
Тэл.: 774 613 356